Pobrano z otouczelnie. więcej arkuszy oraz wyszukiwarki uczelni i kierunków studiów

CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

| WYPEŁNIA ZDAJĄCY | |
|---|---|
| KOD | PESEL |
| | |

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# Egzamin maturalny *Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Symbol arkusza*
MMBB-R0-100-2305

DATA: **17 maja 2023 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **35**

| WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY |
|---|
| Uprawnienia zdającego do: |
| ☐ dostosowania zasad oceniania. |

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 15 stron.
   Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
4. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
5. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
6. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
7. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
8. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
9. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2022/2023 i 2023/2024**
**(zgodna z wymaganiami egzaminacyjnymi)**

**Poziom podstawowy**
Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Бібліі*
Ян Баршчэўскі, *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* (*Плачка*, выбраныя фрагменты)
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы, Мужыцкая праўда № 1*
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай, Калыханка,* выбраныя вершы
Змітрок Бядуля, *На Каляды к сыну, Пяць лыжак заціркі*
Цётка, *Шануйце роднае слова*
Максім Багдановіч, *Апокрыф, Хто мы такія, Санет*, выбраныя вершы
Максім Гарэцкі, *Рускі, Стары прафесар*
Янка Купала, *Курган, Незалежнасць*, *Явар і каліна*, *Спадчына*, выбраныя вершы
Якуб Колас, *Новая зямля*, *Што яны страцілі*
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская…*, выбраныя вершы
Янка Брыль, *Галя, Маці*
Ян Скрыган, *Слепата*
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*)
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі*, *Дарога праз лес*
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*), *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*
Сакрат Яновіч, *Гасцінец*, *Прыгожай, Бацькаў гнеў*, *Вёха – багіня ганьбы*
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві...*, выбраныя вершы
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай)
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*
Алесь Барскі, *Беластоцкі край, Я сын зямлі беластоцкай...*, *Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*)
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1-га раздзела часткі другой)
Ігар Бабкоў, *Хвілінка* (фрагмент 6-га раздзела часткі *Паветраны шар*).

**Poziom rozszerzony**
Максім Багдановіч, *За сто лет*
Максім Гарэцкі, *Фантазія*
Якуб Колас, *У палескай глушы* (фрагмент *XVI часткі)*
Янка Купала, *Тутэйшыя*
Рыгор Барадулін, *Жыццё і паэзія*
Сакрат Яновіч, *Пад знакам Арла й Пагоні* (фрагмент *30. Эліты)*
Ларыса Геніюш, *Споведзь*
Надзея Артымовіч, *Ёсць тое...,* выбраныя вершы
Алесь Разанаў, *Sumus ne simus,* выбраныя вершы
Вольга Рымша, *Рэквіем*
Уладзімір Арлоў, *Незалежнасць – гэта...*
Барыс Пятровіч, *Трызненні* (фрагмент *Шчасце быць – 1).*

**Inne lektury obowiązkowe zamieszczone w *Informatorze o egzaminie maturalnym z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej od roku szkolnego 2022/2023*, do których również można się odwołać**

**Poziom podstawowy**
Максім Танк, *Рукі маці*, выбраныя вершы
Віктар Швед, *Беласточчына*, выбраныя вершы
Уладзімір Някляеў, *Праводзіла з дому*, выбраныя вершы
Віктар Шніп, *Жыццё, нібыта нітка Арыядны...*, выбраныя вершы.

**Выберы адну з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.**

- Твая праца павінна складацца не менш чым з **350 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1. (0–35)

**Выбар паміж служэннем народу і служэннем мастацтву – ці можна іх спалучыць? Паразважай над пытаннем на аснове параўнаўчай інтэрпрэтацыі прыведзеных ніжэй тэкстаў Янкі Купалы *За ўсё...* і Уладзіміра Караткевіча *Паэт*.**

Янка Купала

***За ўсё...***

За ўсё, што сёння маю,
Што даў мне мой народ:
За кут у родным краю,
За хлеб-соль без клапот, –

Я адплаціў народу
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.

Для Бацькаўшчыны беднай,
Для ўпаўшых яе сіл
Складаў я гімн пабедны
Сярод крыжоў, магіл.

Змагаўшыся з напасцяй
За шчасце для людзей,
Не раз пісаў ў няшчасці
Крывёй з сваіх грудзей.

Уносіў гэтым долю
Сваю для ўсіх дабра,
А болей... Што ж там болей
Жадаць ад песняра?!

Янка Купала, *За ўсё…*, knihi.com

Уладзімір Караткевіч
***Паэт***

Брусок спявае ціхую малітву,
Ды зрэдку іскру кіне над сабой –
Пакуль нажы не зазвіняць у бітве
І шаблі горда не ўзнясуцца ў бой.
Няма ў яго ні вастрыя, ні джала,
Патрэбен ён хіба сярпам крывым,
Пакуль у похвах спяць усе кінжалы,
Усе нажы, наточаныя ім.
І на папрок, чаму не йдзе ён біцца
Чаму ён не падобны да мяча,
Ён сціпла спіць у нейкай там брусніцы,
Пакуль тупіцца сталі прыйдзе час.
Але ж, узяты у баі няроўным,
Палонны нож – як спынены парыў –
Хіба сказаў даспехам у катоўні,
Які брусок і дзе яго вастрыў?
Маўчаў, як нож. Маўчаў, як крыж на полі,
Бо ведаў ён няпісаны закон:
Спявае нож у час вайны за волю,
Брусок – у рабства час спявае ён.
Калі ж залье крывёй радзімы пожні,
І пойдзе гнеў да эшафотных стром,
І зломіцца аб сталь кінжал апошні –
Ну што ж?
Тады ўжо можна і бруском.

Уладзімір Караткевіч, *Паэт*, knihi.com

Тэма 2. (0–35)
**Рамантычныя матывы ў беларускай літаратуры. Паразважай над тэмай, абапіраючыся на прыведзены ніжэй тэкст Альгерда Бахарэвіча і два выбраныя творы беларускай літаратуры.**

Альгерд Бахарэвіч
***Ключ ад краіны***

У 1980 годзе ў італьянскім выдавецтве „Bompiani” выйшаў першы раман тады яшчэ не надта вядомага вучонага-медыевіста Умберта Эка пад назваю „Імя ружы”. […]

У тым самым годзе […] у беларускім часопісе „Маладосць” друкаваўся па частках новы твор даўно ўжо прызнанага ў Савецкім Саюзе пісьменніка Уладзіміра Караткевіча „Чорны замак Альшанскі”. Яны былі амаль аднагодкі (Эка маладзейшы за Караткевіча на два гады); абодвух жывіла дзіўная, дзіцячая любоў да гісторыі. Італьянскага аўтара наперадзе чакала сусветная слава, кожная яго наступная кніга зробіцца падзеяй […]. Цяжка хвораму Караткевічу, які ўжо напісаў усе свае самыя значныя кнігі, у 1980-м заставалася жыць менш за чатыры гады. Яго слава так і не выйшла за межы славянскага свету. Тым не менш у самой Беларусі ён мае статус куды больш культавы,

чым Эка ў цэлым свеце. Яшчэ зусім маладым літаратарам Эка меў у сваім распараджэнні гатовую гісторыю Італіі і Еўропы, процьму навуковых даследаванняў і артэфактаў, што валяліся пад нагамі, а таксама італьянскі нацыянальны міф. Маладому Караткевічу сваю Беларусь з яе гісторыяй і яе міфам трэба было стварыць. Вычытаць між чужых радкоў. Убачыць там, дзе замест гісторыі, здавалася, было закатанае ў бетон нічыйнае поле. Уявіць. Напісаць. Прыдумаць. […]

Калі б у беларусаў не было сваёй гісторыі, яе трэба было б выдумаць. Гэта таксама Караткевічавы словы, нешта сярэдняе паміж міжвольным прызнаннем і маніфестам. У розных апытаннях кшталту „Як я стаў тым, кім я стаў” Караткевіч мусіць ісці на першым месцы сярод названых крыніц уплыву, і з вялікім адрывам. Менавіта ён шмат каго зрабіў беларусам. Дапамог выдумаць сябе. У кожнага з яго чытачоў атрымлівалася па-свойму. У меру ўласных таленту, фантазіі і густу. […] Але кожнага Караткевіч у свой час чапляў – варта было разгарнуць кнігу, любы з раманаў. […]

Караткевіч – чалавек з ключом, яго мэта – адкрыць, завабіць, паказаць дарогу. У прадмове яго кнігі для школьнікаў „Зямля пад белымі крыламі” ён сам кажа пра тое, што дае чытачам „ключ ад краіны”: а далей вы ўжо самі... […]

У чым часцей за ўсё абвінавачваюць Караткевіча, дык гэта ў тым, што ён браў чужыя і ўжо даўно распрацаваныя сюжэты і пераносіў іх на беларускую глебу. Так бы мовіць, яшчэ больш спрашчаў сабе тую „простую задачу”. […] Можна падумаць, Эка з нічога ствараў свае лабірынты і выспы. […]

Аддаючы належнае Караткевічу-паэту і Караткевічу-драматургу, не буду крывіць душой. Перш за ўсё ён празаік. І наўрад ці зрабіўся б тым Караткевічам, калі б абмежаваўся вершамі […]. Усё б гэта так і засталося проста словамі – і новая вера не была б створаная. Сярод яго прозы я вылучаю для сябе „Паляванне”, „Каласы”, „Хрыста” і „Ладдзю” – такі вось квадрат Караткевіча. Усе гэтыя тэксты падобныя паміж сабою – і кожны ўтварае неабходны кут, без якога іншыя нешта губляюць. Чатыры кірункі, як чатыры бакі свету, якім адкрываецца яго Беларусь. Якая заўжды ў цэнтры. Як той пакой бібліятэкі, у які ніколі не трапіць.

Караткевіч – апошні рамантык беларускай літаратуры. І наўрад ці ўжо нехта адбярэ ў яго гэты тытул. Бо ён выдумаў нам месца, дзе мы жывём. „Балотныя Яліны і іх ваколіцы”. Кнігу, разгорнутую на самым цікавым месцы.

Паводле: Альгерд Бахарэвіч, *Ключ ад краіны*, svaboda.org

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** 

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|
| | | |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **0** | **1** | *Brak lektury obowiązkowej.* | *Nie dotyczy problemu.* | *Nie jest wypowiedzią argumentacyjną.* |

| | | | | | | | | | | | *Liczba błędów rzeczowych* | ***OGÓŁEM KLiK*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | | |
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3a** | **Struktura wypowiedzi** | **0** | **1** | **2** | **3** |
| | | G | F E | C D | B |

| | | *Liczba błędów w spójności* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3b** | **Spójność wypowiedzi** | | **0** | **1** | **2** | **3** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3c** | **Styl wypowiedzi** | **0** | **1** |

| | | *Liczba błędów językowych* | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4a** | **Zakres i poprawność środków językowych** | | **0** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** |
| | | | 3H 3G 3F 2H 2G 1H | 3E 2F 1G | 3D 2E 1F | 3C 2D 1E | 3B 2C 1D | 3A 2B 1C | 2A | 1B |

| | | *Liczba błędów ortograficznych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4b** | **Poprawność ortograficzna** | | **0** | **1** | **2** |

| | | *Liczba błędów interpunkcyjnych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4c** | **Poprawność interpunkcyjna** | | **0** | **1** | **2** |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*


# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*